павінен быць аддадзены мастацкай літаратуры, бо бібліятэкары, асабліва па спецыялізацыі „Масавыя бібліятэкі", у сваёй прафесійнай дзейнасці маюць справу з захаваннем, апрацоўкай і распаўсюджваннем сярод чытачоў менавіта яе.

Вялікае значэнне мае і матэрыяльнае забеспячэнне навучання на факультэце. З-за адсутнасці сродкаў выкладчыкі не маюць магчымасці выкарыстоўваць сучасныя спосабы распаўсюджвання культуры і інфармацыі і не вучаць студэнтаў валодаць імі. У 1991 г. інстытут культуры змог набыць чатыры камп'ютэры, але гэта не можа задаволіць патрэбы навучання студэнтаў на такім узроўні, які быў бы адэкватны сусветным дасягненням у падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў.

### Літаратура

1. *Ягодин Г.* Идти навстречу // Правда. 1989. 15 авг.

В.М. БІГЕЗА, канд. філал. навук (МІК)

## ПЫТАННІ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ РАБОТЫ З ЮНЫМІ ЧЫТАЧАМІ

Фарміраванне спецыяліста – працэс шматгранны. Адна з яго састаўляючых – прафесійная арыентацыя моладзі і адбор у інстытут маладых людзей, якія добра ўяўляюць змест сваёй будучай прафесіі. Гэты працэс вельмі важны, бо, як вядома, ад правільнага выбару прафесіі залежыць не толькі лёс асобы, але і дабрабыт грамадства ў цэлым, яго эканамічная і маральная стабільнасць, жыццяздольнасць.

У інстытуце штогод праводзіцца дзень адчыненых дзвярэй, у які выкладчыкі знаёмяць прысутных з характарам прафесіі бібліятэчнага работніка. З мэтай удасканальвання прафарыентацыйнай работы арганізуюцца выезды выкладчыкаў у школы розных гарадоў і сельскай мясцовасці рэспублікі. Станоўчага эфекту можна дабіцца, устанавіўшы цесныя сувязі з вучэбна-вытворчымі камбінатамі, створанымі пры школах (напрыклад, у г. Лідзе), а таксама непасрэдна з бібліятэкамі, што абслугоўваюць падлеткаў.

У цяперашні час падрыхтоўка будучых кіраўнікоў дзіцячага чытання ажыццяўляецца комплексна, роўнае значэнне прыдаецца як грамадска-палітычным, так і агульнанавуковым і спецыяльным дысцыплінам, а таксама вучэбна-вытворчай практыцы, самастойнай працы студэнтаў. Аднак гэты комплекс дысцыплін мае некаторыя недахопы. На наш погляд, гэта выяўляецца ў недастатковай псіхолага-педагагічнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў, веды якіх атрыманы ў асноўным на агульных курсах педагогікі і псіхалогіі. Сучасны кіраўнік дзіцячым чытаннем павінен валодаць тэорыяй і практыкай выхавання, навучання і адукацыі падрастаючага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакалення, разбірацца ў сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцях асобы. У нейкай меры вырашае гэту праблему ўведзены курс „Псіхалогія чытання дзяцей". Разам з тым сёння мы кажам пра няўменне бібліятэкара мець зносіны з чытачом, у чым таксама ёсць віна ВНУ. Таму, на нашу думку, мэтазгодна чытанне спецкурса „Псіхалогія зносін бібліятэкара і юнага чытача", у якім пераважная колькасць гадзін павінна адводзіцца практычным заняткам на базе бібліятэкі.

Удасканальванне падрыхтоўкі спецыялістаў для працы з юнымі чытачамі – гэта ў першую чаргу паляпшэнне якасці выкладання. У значнай ступені павышэнню эфектыўнасці навучання садзейнічае актывізацыя пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Паколькі галоўная мэта бібліяграфічнай падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў – усебаковая тэарэтычная і практычная падрыхтоўка да ўдзелу ва ўсіх працэсах бібліяграфічнай працы ў бібліятэцы, у ключавых тэмах курса „Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва" („Рэкамендацыйная бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва", „Методыка састаўлення рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў для дзяцей і юнацтва", „Рэкамендацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў дзіцячых і юнацкіх бібліятэках") удзяляецца ўвага як канкрэтным крыніцам бібліяграфічнай інфармацыі, так і фарміраванню ў студэнтаў з дапамогай актыўных метадаў навучання (дзелавыя гульні, творчыя заданні, дыскусіі) уменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні іх у працы з юнымі чытачамі. Безумоўна, адным з эфектыўных сродкаў павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца праблемнае навучанне.

Падкрэсліваючы значнасць агульнатэарэтычнай падрыхтоўкі спецыялістаў, асобна трэба сказаць аб іх эстэтычнай адукаванасці. Выхаванне эстэтычна пісьменнага чытача – адна з самых актуальных задач бібліятэчнай работы з падрастаючым пакаленнем. Таму вучэбны працэс неабходна арыентаваць на вырашэнне гэтай задачы. Вялікую ролю тут адыгрываюць курсы дзіцячай літаратуры. Студэнты павінны ведаць гісторыю літаратуры, сучасную літаратуру, літаратуразнаўства. Але курс „Уводзіны ў літаратуразнаўства", які раней выкладаўся студэнтам спецыялізацыі, цяпер чамусьці знік. Калі ж будучы спецыяліст не навучыцца ў ВНУ метадам аналіза літаратурнага твора, які дазваляе рабіць вывад аб яго сутнасці, дык аб якіх жа дзейсных формах работы з гэтым творам можна казаць.

На нашу думку, у час чытання лекцый па дзіцячай літаратуры неабходна ўлічваць прынцыпы пераемнасці і комплекснасці ў выкладанні (асабліва пры правядзенні семінарскіх заняткаў па курсу „Кіраўніцтва дзіцячым чытаннем").

Вялікае значэнне мае падрыхтоўка студэнтаў у галіне беларускай дзіцячай літаратуры. На вывучэнне гэтага курса, на жаль, адведзена ўсяго 32 гадзіны, за якія студэнты могуць атрымаць толькі фрагментарныя веды. Зусім не застаецца часу на знаёмства з перакладамі беларускай дзіцячай літаратуры на мовы іншых народаў. Да таго ж недастатковае веданне студэнтамі мовы ўскладняе вывучэнне твораў у арыгінале, не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе адчуць іх сапраўдную эстэтычную каштоўнасць, непаўторны нацыянальны каларыт. Думаецца, што маларэзультатыўная прапаганда беларускай дзіцячай літаратуры ў бібліятэках рэспублікі тлумачыцца не толькі непадрыхтаванасцю бібліятэкара, але і беднасцю фондаў.

Дзеля паглыблення інтарэсу да вывучэння курса неабходна часцей арганізоўваць сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, а таксама паездкі па памятных мясцінах.

З мэтай павышэння прэстыжу літаратурных дысцыплін у нашай ВНУ, і спецыялізацыі ў прыватнасці, нам уяўляецца мэтазгодным увядзенне дзяржаўнага экзамену па літаратуры.

Павышэнню якасці выкладання будзе садзейнічаць правядзенне розных відаў заняткаў з набліжэннем іх да рэальных умоў прафесійнай дзейнасці, мадэліраванне канкрэтных вытворчых сітуацый. Глыбокая ўзаемасувязь навучання з практыкай работы бібліятэк, з даследаваннем яе новых магчымасцей павінна стаць традыцыяй.

Важным у справе падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, на наш погляд, з'яўляецца правільная арганізацыя вучэбна-даследнай работы студэнтаў, бо яна дазваляе раскрыць індывідуальныя магчымасці, дзелавы патэнцыял студэнта, прывівае даследныя, творчыя навыкі. Неабходна імкнуцца да таго, каб заданні вучэбна-даследнай работы знаходзілі прымяненне ў будучай практычнай дзейнасці студэнтаў.

Амаль кожны студэнт спецыялізацыі павінен прайсці школу навуковага пошуку. У цяперашні час выкладчыкамі ствараюцца картатэкі перадавога вопыту бібліятэчнай работы. Аднак, відаць, да гэтай работы неабходна прыцягнуць і студэнтаў, асабліва ў час практыкі, што дазволіць ім глыбей унікнуць у практычную дзейнасць і ў далейшым больш упэўнена адчуваць сябе ў час стажыроўкі.

Паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў для дзіцячых бібліятэк дапамогуць сістэматычныя дзелавыя сустрэчы з бібліятэчнымі работнікамі. Кантакт з імі дазволіць студэнтам лепш арыентавацца ў праблемах бібліятэчнай практыкі, а выкладчыкам – у праблематыцы даследаванняў.

Закрыццё кафедры дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі ў Мінскім інстытуце культуры, безумоўна, не садзейнічае паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Немэтазгоднай, на наш погляд, з'яўляецца і рэарганізацыя абласных дзіцячых бібліятэк у аддзелы, сектары пры абласных бібліятэках.

Неабходна падкрэсліць, што з уручэннем дыпломаў дзейнасць педагагічнага калектыву па падрыхтоўцы спецыялістаў не завяршаецца. Мы імкнемся падтрымліваць кантакты з былымі студэнтамі, таму што, прыступаючы да самастойнай працы, яны асабліва адчуваюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. З гэтай мэтай у нас праводзяцца пісьмовыя кансультацыі, сустрэчы выпускнікоў, канферэнцыі. Пры гэтым не толькі мы дапамагаем маладым спецыялістам замацавацца ў сваёй прафесіі, але і яны забяспечваюць нас інфармацыяй аб тым, наколькі змест навучання адпавядае па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трабаванням практычнай работы. Такім чынам, сувязь з выпускнікамі – гэта ўмова далейшага ўдасканальвання вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Вырашэнню праблемы паляпшэння падрыхтоўкі кадраў для работы з юнымі чытачамі можа садзейнічаць у некаторай ступені большая зацікаўленасць у гэтай справе бібліятэк рэспублікі. Часта кіраўніцтва на месцах не занепакоена тым, што выпускнікі спецыялізацыі працуюць не па свайму профілю. Веданне такой перспектывы не прыносіць карысці студэнтам.

Такім чынам, удасканальванне падрыхтоўкі спецыялістаў для работы з юнымі чытачамі – гэта пошук новых, сучасных прыёмаў навучання, шляхоў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, а таксама аказанне зацікаўленай, дзелавой дапамогі бібліятэкам рэспублікі. Клапаціцца аб нашай будучыні – наша агульная задача, і вырашаць яе мы павінны разам.

Л.М. ІСАЕНКА, канд. філал. навук (МІК)

## ПАДРЫХТАВАНАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ ДА ВЫХАВАННЯ МАСТАЦКАГА ГУСТУ Ў ЧЫТАЧОЎ

Маральнае ўдасканаленне чалавека – неабходная перадумова вырашэння задач, якія стаяць перад нашым грамадствам у сучасны пераломны перыяд гісторыі. Яно немагчыма без эстэтычнага выхавання, што адбываецца пры асэнсаванні мастацкіх твораў.

Героем мастацкай літаратуры з'яўляецца асоба ва ўсёй шматграннасці яе духоўных інтарэсаў, думак і пачуццяў, ва ўсім багацці ўнутранага жыцця і адносін з другімі людзьмі. Мастацкая літаратура адлюстроўвае розныя бакі жыцця, у ёй могуць быць пастаўлены праблемы філасофскія, сацыяльна-псіхалагічныя, этычныя, эстэтычныя і інш. Яна ўздзейнічае на інтэлект і эмоцыі і ў сваёй асноўнай і лепшай частцы звернута да шырокіх народных мас. Літаратура заўсёды была крыніцай ідэйна-маральных перакананняў, добрага мастацкага густу.

Сваю асаблівую ролю яна можа адыграць толькі пры пэўных умовах. Сярод іх вялікае значэнне набывае падрыхтаванасць бібліятэчных кадраў. Яны з'яўляюцца пасрэднікам паміж вялікай літаратурай і чытачом, могуць да пэўнай ступені кіраваць чытаннем, выбарам і ўспрыманнем літаратурных твораў. Скарбы сусветнай літаратуры, у якія ўваходзіць нямала твораў беларускіх пісьменнікаў, дазваляюць выхоўваць і развіваць мастацкі густ, што садзейнічае свядомаму выбару твораў для чытання, іх вартаснаму эстэтычнаму ўспрыманню і правільнаму меркаванню аб іх ідэйна-эстэтычных якасцях. Для вырашэння гэтай задачы неабходна перш за ўсё глыбокае вывучэнне сённяшняга стану развіцця мастацкага густу чытачоў.

У апошнія гады нацыянальная бібліятэка Беларусі правяла ў не-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ